жие и в рядах Советской Армии стойко и мужественно защищали рубежи нашей Родины. Не жалея сил, ценой собственной жизни они победили.

Литература:
1. Андреев Е.Н. Небо вокруг меня. – М., Изд-во ДОСААФ СССР, 1983. – 72 с. – Тир. 100000/ 72 с.
2. Пашинин В.А. Герои среди нас. – Изд. 2-е, доп. – М.: Физкультура и спорт, 1975. – 184 с.
3. Горбунов Л.Б. Уходили на фронт чемпионы. – Серия «Физкультура и спорт». – № 3, 1980. – 160 с.

## СВІСЛАЦКІ РАЁН У ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

***Нічыпарук Т.У.***
4 к., 7 гр., ЛФ УА «Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»
Ваенная кафедра
Навуковы кіраўнік – канд. мед. навук, дац. *Івашын В.М.*

Гісторыя Свіслаччыны—гэта гісторыя мінулага і сучаснага, часціца нашай Радзімы. Свіслаччына мае вялікую гістарычную спадчыну. У ёй знайшлі адлюстраванне перамогі і неўдачы, поспехі і праблемы, характэрныя для ўсёй Беларусі.

Становішча Свіслаччыны ў гады Вялікай Айчыннай вайны было вельмі складаным і супярэчлівым.

Напярэдадні вайны, пасля далучэння тэрыторыі Заходняй Беларусі да БССР, на Свіслаччыне пачаліся шматлікія пераўтварэнні, якія станоўча адлюстроўваліся на ўсіх баках жыцця грамадства.

15 студзеня 1940 года быў створаны Свіслацкі раён Беластоцкай вобласці ў складзе 17 сельсаветаў. 30 лютага – РК КП(б)Б. Перадавыя сяляне пачалі пераходзіць на сацыялістычны шлях вядзення гаспадаркі. На тэрыторыі цяперашняга Свіслацкага раёна было створана 10 калгасаў, 2 машынна-трактарныя станцыі.

Значныя поспехі былі дасягнуты ў культуры і ў галіне аховы здароўя. Дзейнічала 10 хат-чытален, 35 чырвоных вугалкоў, 1 дом культуры і раённая бібліятэка, кінатэатр «Звязда». У заходнія раёны БССР было накіравана 150 урачоў, 650 фельчараў і больш 2 тыс. медыцынскіх сясцёр.

Аднак першыя крокі сацыялістычнага будаўніцтва ў заходніх абласцях Беларусі былі перарваны вераломным нападам фашысцкай Германіі на нашу краіну. Пачалася Вялікая Айчынная вайна.

На досвітку 22 чэрвеня 1941 года войскі фашысцкай Германіі ўварваліся на тэрыторыю Савецкага Саюза. Фашысцкія самалёты з першых

гадзін вайны бамбілі г. Свіслач і ст. Свіслач, а таксама размешчаныя недалёка ад іх, у Кватарах, і недабудаваныя яшчэ аэрадромныя пляцоўкі, ваенныя аэрадромы каля вёсак Стокі і Дашкавічы. Пасля некалькіх налётаў гэтыя аэрадромы былі поўнасцю зруйнаваны, а самалёты спалены.

На тэрыторыі Беларусі наступала буйнейшая нямецкая група армій «Цэнтр». Заходнюю мяжу на беларускім участку ў той час прыкрывалі тры арміі: на левым флангу 4-я (камандуючы генерал-маёр А.А. Карабкоў), у цэнтры 10-я (камандуючы генерал-маёр К.Дз. Голубеў) і на правым флангу 3-я армія (камандуючы і генерал-лейтэнант В.І. Кузняцоў).

29 чэрвеня праціўніку ўдалося захапіць Гродна і выйсці да Крынак, абысці з поўначы Беласток, ударам з раёна Грудска падысці з поўдня амаль шчыльна да Крынак і тым самым заціснуць у кальцо войскі, якія змагаліся на Беластоцкім выступе. Апошнія вымушаны былі нанесці контрудар у раёне Крынкі–Грудск у накірунку на Свіслач, Ваўкавыск і Зэльву. Такім чынам, частка тэрыторыі Свіслацкага раёна аказалася ў самым цэнтры падзей.

У выключна цяжкім становішчы ў тыя дні аказаўся 13-ы механізаваны корпус. У Белавежскай пушчы ён перагрупаваўся. 31-ая танкавая дывізія з рэшткамі тэхнікі рушыла ў накірунку Новы Двор–Поразава і далей на Зэльву. Сюды ж адыходзілі кавалерысты, а астатнія часці са штабам корпуса і батальёнам сувязі, аб'яднаўшыся ў адну баявую групу, пайшлі на Свіслач і Мсцібава. Камандаваў войскамі гэтага корпуса і кіраваў абаронай на лініі Свіслач–Поразава–Новы Двор генерал-маёр Пётр Мікалаевіч Ахлюсцін. Прыняўшы няроўны бой з фашыстамі недалёка ад дзяржаўнай граніцы, корпус вымушаны быў адступаць.

З 24 па 25 чэрвеня салдаты 31-й дывізіі і 62-га танкавага палка пабудавалі абарончыя ўмацаванні і падрыхтаваліся да абароны. На світанні гітлераўскія войскі пачалі бамбіць занятыя механізаваным корпусам рубяжы. У абаронцаў участка Свіслач–Поразава засталося ў страі ўсяго 10 лёгкіх танкаў. Узначальваў танкавую часць капітан Шведаў. Гітлераўцы былі знішчаны амаль поўнасцю. Вялікія страты панеслі і чырвонаармейцы.

13-ы мехкорпус вымушаны быў адысці і пад вечар, 25 чэрвеня, фашысты ўступілі ў Свіслач. Асноўныя іх сілы былі спынены ў парку. Раптам наляцелі два савецкіх самалёта і пачалі бамбіць гэтае месца. Каля сотні фашыстаў было знішчана. Варожая артылерыя падвергнула жорсткаму абстрэлу Свіслач і прылеглыя наваколлі. Палалі жылыя хаты. Вораг не пашкадаваў праваслаўную царкву і каталіцкі касцёл. Абаранялым на чале з П.М. Ахлюсціным і яго штабам прыйшлося адступіць па накірунку да мястэчка Мсцібава, дзе потым яны былі акружаныя фашыстамі. П.М. Ахлюсціну нічога не заставалася, як аддаць загад капітану Крамнёву знішчыць дакументы корпуса. Затым ён сабраў жывых байцоў і камандзіраў на гэтым участку і ўначы павёў іх на прарыў варожага кальца.



Рэпазіторый ГрГМУ

Аперацыя атрымалася і генерал Ахлюсцін, злучыўшыся з іншымі падраздзяленнямі корпуса. На пераправе праз Сож астаткі 13-га мехкорпуса нечакана былі атакаваныя з зямлі і паветра фашыстамі. Пераправа была разбіта. Генерал-маёр П.М. Ахлюсцін быў забіты.

Трагічна склаўся лёс і другога камандзіра, генерал-маёра танкавых войск, намесніка камандзіра 13-га мехкорпуса Васіля Іванавіча Іванова. Ён абараняў мяжу на рацэ Нурэц. З наступленнем цемры 22 чэрвеня В.І. Іваноў нанёс танкавы ўдар па суперніку, які заняў агнявыя пазіцыі паўночна-заходняга мястэчка Боцькі (цяпер Польшча). Фашысты хоць і аказалі супраціўленне, але змушаныя былі адысці. Але ў сярэдзіне ночы прыйшоў загад адыходзіць у кірунку да Ваўкавыска. Адарваўшыся ад суперніка, дывізія разам з іншымі падраздзяленнямі 13-га мехкорпуса пачала рэйд на ўсход. Яна рухалася па Белавежскай пушчы, а 27 чэрвеня выйшла на ўсходнюю яе ўскраіну недалёка ад Новага Двара. 30 чэрвеня 1944 года генерал Іваноў загінуў ад кулі нямецкага дыверсанта, пераапранутага ў форму маёра Чырвонай Арміі.

Жорсткі бязлітасны бой з ворагам праходзіў і каля Новага Двара. Вайна не абышла і невялікі пасёлак Поразава.

Акупацыйны рэжым – вынік планамернага ажыццяўлення дзяржаўнай палітыкі фашысцкай Германіі. Акупаваўшы Беларусь, гітлераўцы ўстанавілі на яе тэрыторыі «новы парадак» – рэжым нябачнага крывавага тэрору, жудасных здзекаў і гвалтаў над насельніцтвам. Для ажыццяўлення сваей палітыкі гітлераўцы стварылі айнзацкаманды, зондэркаманды, тайную палявую паліцыю, паліцыю бяспекі, фельдкамендатуры, ортскамендатуры, жандармерыю і іншыя карныя органы.

З прыходам нямецка-фашысцкіх захопнікаў адразу аднавілася ранейшае адміністрацыйнае дзяленне, пачалі дзейнічаць гміны. Войтам гміны ў Свіслачы стаў фольксдойчэ Функе, камендантам – сяржант Абвёсла. Самыя бязлітасныя паліцаі былі Акруттны і Клэк. Праз месяц была ўстаноўлена акупацыйная нямецкая адміністрацыя, гміна перайменавана ў камісарыят. Першым нямецкім камісарам стаў гітлеравец фон Одэнбах.

26 чэрвеня 1941 года фашысты ўварваліся ў Свіслач. Наш раён быў уключаны ў асобную акругу «Беласток». На гэтай тэрыторыі дзейнічалі законы і суд, як у Германіі. Кіравала тут усходне-пруская адміністрацыя. Пасёлак стаў цэнтрам Свіслацкага амтскамісарыяту. У мястэчку ў той час налічвалася каля 8 тысяч чалавек, у тым ліку больш за 3 тысячы яўрэяў.

З першых дзён устанаўлення «новага парадку» супраць яўрэяў праводзілася палітыка праследавання і тэрору, здзекі, збівання, расстрэлы. Нямецкія ўлады прыцягвалі на прымусовую працу яўрэяў з 16 да 60 гадоў. Для іх быў уведзены адметны знак – жоўтая зорка на левым баку грудзей і плячэй. 1 лістапада 1941 года паступіў загад усім яўрэям перасяліцца у гета. На абмежаванай тэрыторыі ў межах цяперашняй вуліцы Масонава было



Репозиторий ГрГМУ

вымушана пасяліцца ўсё насельніцтва яўрэйскай нацянальнасці Свіслачы. 1 лістапада 1942 года ўсіх, хто застаўся жывым (1536 старых і малых жанчын і дзяцей), фашысты накіравалі ва ўрочышча Вешаўнік, дзе ўсе яны былі па-зверскі расстраляны і засыпаны ў агульных магілах-ірвах. Яўрэі ўнеслі важкі ўклад у развіццё рамяства, гандлю, прамысловасці Свіслачы.

3 жніўня 1942 года атрад немцаў прыехалі досвіткам у в. Нязбодзічы, акружылі вёску і сагналі ў адно месца ўсё мужчынскае насельніцтва. 42 чалавекі было забіта, астатніх пасля збівання адпусцілі дадому.

Батальён № 323 здзейсніў на Свіслацкай зямлі страшнае, жудаснае і крывавае злачынства, закатаваўшы ў кар'еры каля Гаркаўшчыны сорак чатыры жыхары вёсак Нязбодзічы і Качкі ў чэрвені 1942 года.

«Новы парадак» наводзілі гітлераўцы і Белавежы. Яна стала аб'ектам дзейнасці карнага батальёна № 322. Фашысты праводзілі ў Белавежы публічныя акцыі пакарання праз павешанні. Было павешана 129 чалавек, з якіх 110 – мужчыны, 15 – жанчыны і пяцёра – непаўналетнія.

Адступаючы, фашысты спалілі прыгожы палац, у якім размяшчаўся багаты музей флоры і фауны Белавежы, кнігазбор польскіх, рускіх і беларускіх вучоных, зрубілі каля 700 кубаметраў драўніны. З 19 зуброў у 1942–1943 гг. загінула 7.

Цяпер Свіслаччына жыве актыўным жыццём. І толькі помнікі даносяць да нас гукі мінулага, гукі вайны. Мінулае края – гэта не проста гістарычная з’ява, гэта падмурак, на якім будуецца сёняшняя гісторыя, гэта арыентыр на будучае, якое павінна быць выбрана самім чалавекам.

## ПЕРЕЛОМНЫЙ МОМЕНТ В ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЕ – БИТВА ПОД МОСКВОЙ

***Овсяный А.В.***
3 к., 31ТОв взв., ВФ УО «Гродненский государственный университет им. Я. Купалы»
Кафедра тылового обеспечения
Научный руководитель – доцент, подполковник *Кривчиков В.М.*

6 сентября 1941 года. Главнокомандующий Вермахта Адольф Гитлер составляет директиву № 35. Она предписывает: «В ближайшее время, до наступления холодов захватить Москву». Руководителем операции под кодовым названием «Тайфун» назначается главнокомандующий группы армии центр генерал фон Бок. Приказ зачитывают в войсках, офицеры берут с собой парадную форму для марша по красной площади, а эшелоны загружаются крестами за доблесть. Танкам предназначена главная роль в



Репозиторий ГрГМУ